


ПЛАКАТ ВЫПУСКНІКА ЖУРФАКА АЛЯКСАНДРА ПАЎЛЯНКОВА.

Марыя ШАЎЧОНАК

Магчыма, мяне спытаюць,
Адкуль я і хто я такая.
З гонарам найвялікшым
Я адкажу: «Зямная».

І пакажу ў паўзмроку
Зямлю — сваю родную зорку.
Глядзіце, мая Радзіма.
Вунь той я сцежкай хадзіла,
За гэтым возерам сінім
Вёсны страчала і зімы.
А там вунь — чабор і бярозкі
І сосны ля самай вёскі.

На ўскраі, як казка, верас,
У неба глядзіш — не верыш,
Што гэткая неабдымная
Над галавою веліч.
А я, нібы кропля ранняя,
Вецер павее — растане.

Магчыма, мяне спытаюць,
Адкуль я і хто я такая.
З гонарам найвялікшым
Я адкажу: «Зямная».
Усю прыгажосць зямную
У гэты момант адчую.

ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (737) ● Пятніца, 7 сакавіка 1969 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXII

Заўтра жанчыны свету і разам з імі ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначаюць вялікае свята — Дзень салідарнасці жанчын, дзень прызнання іх заслуг у барацьбе за светлыя ідэалы міру і дружбы паміж народамі, за шчасце дзяцей усіх кантынентаў зямлі.

Маці і працаўніца, воін і вучоны — савецкая жанчына на працягу ўсёй гісторыі ішла ў першых радах будаўнікоў самага справядлівага грамадства. Са зброяй у руках яна абараняла заваёвы рэвалюцыі, удзельнічала ў індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі, стварэнні новай культуры, мужна адстаівала Айчыну ў грозныя дні вайны і самааддана залечвала нанесеныя ворагам раны. І ў той жа час яна гадавала і выхоўвала дзяцей — надзею і будучыню народа!

Слава вам, працавітыя, нястомныя, клапатлівыя!

Шчасця вам, мамы, сёстры, жонкі, сяброўкі — любімыя нашы жанчыны!

## СІЛА І ПРЫГАЖОСЦЬ

**Ніхто не стане спрачацца, што галоўная сіла ў нашым калектыве — жанчыны! А прыгажосць! — зноў жа яны! Нездарма наш універсітэцкі паэт Ніл Гілевіч, аддаючы належнае жанчынам, запытваў:**

**— На кім трымаецца наш родны ардэнаносны БДУ!**

**І з задавальненнем адказваў:**

**— На моцнай арміі жанчын!**

**Што гэта так, не цяжка пераканацца. Давайце зойдзем у аўдыторыі гуманітарнага корпуса. За кафедрай у поўным росквіце творчых сіл і педагагічнага майстэрства вы ўбачыце ўсімі паважаных прафесараў, дацэнтаў—настаўніц моладзі. Выкладчыкі і лабаранты, работніцы буфета і абслугоўваючы персанал—куды ні глянь—усюды жанчыны! А колькі чароўных студэнтак, якія сапернічаюць не моднымі прычоскамі, а навуковымі дакладамі, набытымі на камсамольскіх будоўлях працоўнымі навыкамі і кулінарным майстэрствам, вучыцца тут!**

**А біялагічны! І тут, калі меркаваць па рэдкалегіі факультэцкай насценнай газеты «Віта», у складзе якой, за выключэннем рэдактара, адны дзяўчаты — вядучая сіла — жаночая на чале з доктарам біялагічных навук Аленай Паўлаўнай Кесаравай.**

**Праўда, па меры набліжэння да фізічнага факультэта колькасныя пазіцыі жанчын некалькі слабеюць, аднак толькі колькасныя! Жанчыны-фізікі гэтак жа паспяхова, як і мужчыны, прадстаўляюць сваю галіну навукі.**

**А якія ж суадносіны на геолага-геаграфічным і юрыдычным, матэматычным, падрыхтоўчым, завочным! Дакладна выявіць пакуль што не ўдалося, але будзем лічыць, што і там яны ў карысць жанчын. І ўжо зусім відавочная перавага застаецца за жанчынамі ў бібліятэках і бухгалтэрыі, канцылярыі, аддзеле кадраў і іншых універсітэцкіх службах. Іменна тут сагрэюць вас простым чалавечым цяплом, сяброўскім спачуваннем, дадуць карысную параду, падкажуць выхад з цяжкага становішча, аформяць неабходныя дакументы і, нарэшце, выведуць з грашовых цяжкасцей — на ўсё здольныя жанчыны, такія, як Галіна Аляксандраўна Роўнава, Ядвіга Антонаўна Дабрахотава, Еўдакія Барысаўна Іванюценка, Аляксандра Андрэеўна Грышына, Ніна Панцеляймонаўна Якушава, Марыя Аляксееўна Урынёва, Алімпіяда Іванаўна Казакова, Лідзія Аляксееўна Вішнякова і многія-многія іншыя добрасумленныя працаўніцы універсітэцкага калектыву. Сёння мы віншуем вас, дарагія, з наступаючым святам і жадаем нязгаснай маладосці, задавальнення ў рабоце, бязмежнага імкнення прыносіць шчасце людзям!**

## ДЫПЛАМАНТКА

Напэўна не знойдзеш чалавека на факультэце журналістыкі, які б не ведаў Галю Сыраежка. Выдатнай вучобай, актыўнай дзейнасцю ў грамадскім жыцці курса і факультэта, стараннасцю і працавітасцю яна заваявала любоў і павагу аднакурснікаў, сяброў.

Пазнаёміліся мы з ёй упершыню ў пачатку навучальнага года на другім курсе. Раней яна вучылася на завочным, а потым перавялася на стацыянар. На курсе яна адразу вызначылася сярод студэнтаў сціпласцю і стараннасцю. Уважліва слухала лекцыі, глыбока і дасканала вывучала новы матэрыял. Галя не раз радавала выкладчыкаў добрымі, рознабаковымі ведамі. І не дзіўна. Любімым месцам яе была заўсёды «ленінка». Іншы раз мы самі здзіўляліся яе незвычайнай настойлівасці і імкненню пранікнуць у глыбіні навукі. Што і казаць, не раз у душы кожны з нас зайздросціў працавітасці нашай сяброўкі.

Галя не толькі знаходзіла час для вучобы. Без яе ўдзелу цяжка ўявіць сабе вечар, дыспут або сход. З вялікім запалам энергіі яна бралася за любую справу і даводзіла яе заўсёды да канца.

Мне вельмі запомніўся сход на чацвёртым курсе. Справы неяк у пачатку навучальнага года абстаялі не вельмі добра. Некалькі чалавек мелі запазычанасць, прапускалі заняткі. Каб хутчэй выправіць становішча, сабраліся, пагаварылі і вырашылі выбраць новага сакратара камсамольскай арганізацыі, чалавека, які б здолеў наладзіць на курсе работу, карыстаўся б аўтарытэтам сярод аднакурснікаў. Аднагалосна прагаласавалі за Галю.

І работа пайшла. На другі ж дзень у аўдыторыі з'явіўся баявы лісток, у якім вельмі трапна высмейваліся гультаі. Пасля такой праработкі былі ліквідаваны і запазычанасці. Курс сустрэў апошні званок з добрымі вынікамі.

Падабаюцца і такія рысы ў Галі, як дабрата і чуласць. Яны не перашкаджаюць ёй быць прынцыповым камуністам.

Зараз Галіна Сыраежка рыхтуецца да абароны дыпломнай работы. Прадметам яе даследавання стала Віцебская абласная газета, асвятленне на яе старонках пытанняў партыйнага жыцця.

Мы упэўнены, што наша аднакурсніца будзе выдатным журналістам.

**Л. ШАБАН,**
**выпускніца факультэта журналістыкі.**

## ТАКІЯ Ў НАС ДЗЯЎЧАТЫ

**Цудоўных дзяўчат не трэба доўга шукаць. Варта толькі добра прыглядзецца — яны побач, на кожным кроку. Простыя і незвычайныя. Асабліва іх многа на філфаку. Да прыкладу возьмем хоць бы Таню Кісель, студэнтку другога курса аддзялення беларускай мовы і літаратуры. Сціплая, сімпатычная дзяўчына. Заўсёды з прыветнай усмешкай на твары. Кожнаму дапаможа, падтрымае цёплым сяброўскім словам. У любой кампаніі становіцца весела і цікава, калі там прысутнічае Таня. Яна не толькі добры і вясёлы таварыш, але і адна з лепшых на практычных занятках, семінарах. Трэба толькі ўбачыць і паслухаць, як натхнёна і ўпэўнена адказвае яна на пытанні выкладчыка! І хіба ж памыліліся сябры-аднакурснікі, калі выбіралі яе сваім камсамольскім важаком!**

**В. ЖУРОМСКІ,**
**студэнт другога курса філфака.**

# СЛЕД У ЖЫЦЦІ

## *Імі ганарыцца універсітэт*

З Вольгай Піліпаўнай Якушка, дацэнтам кафедры фізічнай геаграфіі, я пазнаёміўся спачатку завочна. На геаграфічным факультэце ёсць стэнд з фотаздымкамі, якія зроблены ў час навуковых экспедыцый выкладчыкамі і студэнтамі. На адным з іх — Вольга Піліпаўна. На галаве шапка-вушанка. Светлыя пасмы валасоў нібы ў інеі. Да вока паднесен акуляр кінакамеры.

Пасля яна казала:

— Не, я не лічу сябе кіна- ці фотамайстрам. Нават «аматар» не зусім тое слова. Здымкі дапамагаюць нам вывучаць глыбей розныя з'явы прыроды. Таму неабходнасць прымушае валодаць тэхнікай здымкі.

А калі Вольга Піліпаўна даведалася аб мэце размовы, настойліва запярэчыла.

— Пісаць пра мяне? Нічога асаблівага і цікавага,— а крыху пазней дадала: — Адна я гэтага не заслугоўваю, а вось пра лабараторыю, калектыў яе — патрэбна.

Лабараторыя азёразнаўства — «неафіцыйнае дзіцё», як тут кажуць, бо Вольга Піліпаўна ўзначальвае калектыў на грамадскіх пачатках.

Захапленне геаграфіяй прыйшло яшчэ ў тыя гады, калі яна вучылася ў сярэдняй школе. Цікавыя ўрокі Леаніда Аляксандравіча Ржэуцкага (цяпер заслужаны настаўнік БССР) паланілі непрыкметна. Пасля школы раздумваць не прыходзілася. «Цяпер ці праз год, але буду вучыцца на геаграфічным факультэце»,—вырашыла яна. Так у 1938 годзе і пачалася для яе вучоба ў БДУ.

Некалькі год назад у дзяржаўным архіве рэспублікі ў рукі В. П. Якушка трапіла выцвіўшая паперка: загад рэктара універсітэта, дзе былі вынесены падзякі студэнтам, якія актыўна ўдзельнічалі ў аднаўленні навучальнай установы. Сярод іншых значылася і яе прозвішча.

Вучоба ва універсітэце закончана на выдатна. Здольную, дапытлівую, улюбёную ў сваю спецыяльнасць дзяўчыну накіроўваюць у аспірантуру. І ўжо ў 1949 годзе малады спецыяліст абараняе кандыдацкую дысертацыю на тэму «Геамарфалогія паўднёвай часткі Мінскай узвышанасці» і застаецца працаваць на кафедры фізічнай геаграфіі. Выкладае спецкурс «Лімналогія» (вучэнне аб азёрах, прычынах іх утварэння, жыхарах і гідрахімічным саставе).

Сваю навуковую работу Вольга Піліпаўна вядзе па вывучэнню азёр Беларусі.

На факультэце даўно ўзнікла пытанне аб вывучэнні беларускіх азёр, але не хапала сродкаў, абсталявання, спецыялісты не мелі належнай падрыхтоўкі...

На лекцыях, практычных занятках, у час экспедыцый Вольга Піліпаўна ўважліва прыглядалася да студэнтаў, знаходзіла больш здольных для навуковай работы. І вось тады з'явілася думка арганізаваць гурток, які б займаўся вывучэннем беларускіх азёр. У 1957 годзе задума была здзейснена. Ахвотнікі знайшліся.

Нямала часу Вольга Піліпаўна аддавала кіраўніцтву гуртком. Матэрыялы даследаванняў былі потым выкарыстаны у вучэбным дапаможніку «Геаграфія азёр Беларусі».



Паступова гурток сталеў, накопліваў вопыт. Выпускнікоў змянялі студэнты малодшых курсаў. З кожным годам расшыралася кола пытанняў, якімі займаўся гурток. А навейшыя прыборы, прыстасаванні і вопыт дапамагалі вырашаць пастаўленыя пытанні больш грунтоўна.

Калі крануліся вывучэння хіміка-механічнага саставу донных адкладанняў, Вольга Піліпаўна заўважыла, што ведаў па хіміі ёй не хапае. І яна пачынае вывучаць хімію глыбей. Апрача самастойных заняткаў, праходзіць стажыроўку ў хімічных лабараторыях політэхнічнага інстытута. І праз пэўны час набывае патрэбныя веды.

Штогод палаткі гурткоўцаў можна было напаткаць на Палескіх азёрах, Браслаўскіх і ля возера Нарач.

Матэрыялы, сабраныя студэнтамі ў час непасрэдных работ у полі, выкарыстоўваліся для курсавых і дыпломных работ. З цягам часу то адзін, то другі з гурткоўцаў, абараніўшы дыплом, пакідаў гурток і пераходзіў на самастойную працу. Каштоўнасць навуковых даследаванняў выхаванцаў В. П. Якушка была відавочная. Іх працу заўважылі. Да работы, над якой працаваў гурток, падключылі двух сталых даследчыкаў.

Пасля Усесаюзнага сімпозіума па праблемах вывучэння азёр, які праходзіў у 1965 годзе ў Мінску, былая студэнцкая група папоўнілася яшчэ трыма вопытнымі даследчыкамі. У выніку была створана лабараторыя.

— Кіраўніцтва лабараторыяй я не лічу грамадскай нагрузкай, — кажа Вольга Піліпаўна. — Праца ў лабараторыі і сярод калектыву студэнтаў не дае мне пастарэць.

Калектыў склаўся дружны. Існуе ён цяпер не толькі ў сценах факультэта. Супрацоўнікі лабараторыі В. Калечыц, І. Мыслівец, П. Бурдыка, М. Лаўрыновіч частыя госці ў кіраўніка лабараторыі. Разам адпачываюць, бываюць у тэатрах.

Чым жа цяпер жыве калектыў лабараторыі? Якія задумы мараць здзейсніць у будучым? Навейшае абсталяванне дазваляе рабіць складаныя даследаванні. Нядаўна быў закончан спорава-пыльцавы аналіз донных адкладанняў возера Нарач. Па першапачатковых даных, узрост яго каля... 14 тысяч год.

Не могуць задаволіцца цяпер лімнолагі часовымі паездкамі на месцы даследаванняў. Іх мара — абсталяваць на Браслаўскіх азёрах стацыянарнае памяшканне, каб мець магчымасць праводзіць пастаянныя назіранні. І гэта ўжо нават не мара. Складзены каштарыс зацверджан рэктарам. Хутка пачнецца будаўніцтва.

У кватэры Вольгі Піліпаўны некалькі шафаў з кнігамі. Сярод спецыяльнай літаратуры значнае месца займае мастацкая.

— Мой любімы пісьменнік — Паустоўскі, — кажа яна.

На шафе і на стале марскія зоркі, кедравыя шышкі, як сведкі і ўспаміны аб разнастайных паездках і экспедыцыях. У такой абстаноўцы гутарка пазбаўляецца афіцыйнасці. Вольга Піліпаўна добры расказчык.

Я праглядаю кнігу «Геаграфія азёр Беларусі». Дзенідзе на палях зроблены заўвагі алоўкам. Яны сведчаць аб крытычных адносінах аўтара да сябе.

Цяпер у выдавецтве «Ураджай» рыхтуецца кніжка, зробленая на аснове дзённікавых запісаў і назіранняў Вольгі Піліпаўны ў шматлікіх паездках. «Блакітныя вочы Беларусі»—такую лірычную назву мае гэты зборнік апавяданняў аб найбольш цікавых азёрах нашай рэспублікі.

За час работы ва універсітэце дацэнтам В. П. Якушка напісана больш 30 навуковых прац. На працягу шасці год Вольга Піліпаўна працавала над ландшафтнымі здымкамі тэрыторыі Беларусі. У выніку складзены буйнамаштабныя карты паўночна-заходняй часткі нашай рэспублікі. Цяпер Вольга Піліпаўна працуе над доктарскай дысертацыяй на тэму «Азёры Беларусі», праводзіць шэраг работ для ўпраўлення гідраметэаслужбы БССР. Камуніст, вучоны, сардэчны чалавек — такой знаюць Вольгу Піліпаўну Якушка не толькі таварышы па рабоце і студэнты, але і выбаршчыкі. Яна неаднаразова выбіралася дэпутатам у раённы і гарадскі Саветы дэпутатаў працоўных горада апраўдвала давер'е. Цяпер В. П. Якушка зноў вылучана кандыдатам у дэпутаты мясцовага Савета.

У. ШАРПІЛА.

# У ІХ — ДВАЙНОЕ СВЯТА

Заўтра на філфаку будзе многа двойчы імяніннікаў. І тут няма нічога дзіўнага: заўтра Міжнародны жаночы дзень, а гэты факультэт ва універсітэце, як вядома, надзвычай багат жанчынамі. 8 Сакавіка—яны імяninніцы.

А чаму і хто двойчы? На гэта пытанне няцяжка адказаць, калі пазнаёміцца з выдадзенымі напярэдадні свята кніжкамі, аўтарамі якіх з'яўляюцца выкладчыкі філфака, а таксама завершанымі на факультэце навуковымі даследаваннямі. Высвятляецца, што аўтарамі большасці навуковых прац з'яўляюцца жанчыны.

Многа год запар даследуе тэму «Якуб Колас і руская літаратура» загадчык кафедры рускай савецкай літаратуры прафесар Л. І. Фігloўская. Шэраг прац яна надрукавала па гэтай тэме, цяпер жа вучоны рыхтуе вялікую манаграфію.

Лінгвістычнае даследаванне прафесара М. А. Жыдовіч «Назоўнік у беларускай мове» ў бліжэйшы час вы зможаце убачыць на кніжных паліцах.

Дацэнт Н. Н. Рамашка здала ў выдавецтва кнігу «Лірычная проза». Гэта актуальнае даследаванне, калі ўлічыць, што ў 60-я гады лірычная проза заняла важнае месца ў творчасці вядучых савецкіх пісьменнікаў. Рыхтуе да друку першую частку сваей вялікай манаграфіі аб горкаўскіх традыцыях ва ўкраінскай савецкай драматургіі дацэнт С. А. Лысенка. Дацэнт В. А. Захарава—сааўтар кнігі «Народная творчасць у барацьбе за чалавека камунізма», а дацэнт Л. Л. Кароткая сумесна з В. С. Карабанам выдала «Хрэстаматыю па уводзінах у літаратуразнаўства»...

Пералік можна было б прадоўжыць, але чытач ужо згадзіўся, што на філфаку заўтра сапраўды будзе шмат двойчы імяніннікаў. Хочацца ад душы іх павіншаваць са святам, з поспехамі ў навуковай працы і пажадаць новага плёну.

У. ДУДКО,
аспірант.

# МАЛЬЧИК ЖДЕТ МАМУ

*Мальчик ждет маму,*
*Молча стоит у ворот,*
*Задумчивый и упрямый.*
*— Что же она не идет?*
*Детсад в этот час*
*оживленный,*
*Расходятся все по домам,*
*Сжимая в своих ладонях*
*Теплые руки мам.*
*— Ну и пусть, задаваки...*
*И, прислонившись к доске,*
*Ему лишь понятные знаки*
*Чертит на мокром песке.*
*На мгновенье в глазенках*
*искры*
*Вспыхнут, будто весна,*
*И тут же погаснут быстро.*
*— Нет, опять не она...*
*Мне хочется встать с ним*
*рядом*
*— Послушай, мальчишка*
*милый,*
*Так я сам ожидал когда-то,*
*И мама всегда приходила.*

*Леонид ПОДОЛЬСКИЙ,*
*студент филфака.*

# ЧВЭРЦЬ ВЕКА — БІБЛІЯТЭЦЫ

Напэўна, нішто так не маладзіць чалавека, як любімая работа. Гады мільгаюць, чаргуюцца падзеі, мяняюцца пакаленні студэнтаў. Першакурснікі становяцца выпускнікамі, выпускнікі аспірантамі, аспіранты кандыдатамі, а затым дактарамі навук. Ва універсітэцкай бібліятэцы, як і раней, іх ветліва сустракаюць адны і тыя ж людзі.



— Не ўяўляем сабе бібліятэкі юрфака без Кацярыны Міхайлаўны Пятосінай і Валянціны Яўгеньеўны Руданоўскай, — гавораць юрысты.

А як можна уявіць, калі Кацярына Міхайлаўна і Валянціна Яўгеньеўна з трыццатых гадоў звязаны з бібліятэкай самымі моцнымі сувязямі — любоўю да сваёй справы. Гэта дзякуючы іх веданню юрыдычнай літаратуры, уменню працаваць з людзьмі факультэцкая бібліятэка стала сапраўдным памочнікам і студэнтаў і выкладчыкаў.

Пяцьдзесят працоўных год за плячыма дырэктара універсітэцкай бібліятэкі Разаліі Герасімаўны Любінай, 25 з іх—у нашай бібліятэцы. З 1944 года, калі разбураны вайной універсітэт толькі падымаўся з руін, Разалія Герасімаўна разам з такімі ж, як яна, энтузіястамі Мар'янай Іванаўнай Падскрабаевай, Аннай Аронаўнай Эвенчык, Вольгай Леанідаўнай Ніканавай і іншымі ўзялася за аднаўленне разрабленай гітлераўцамі кніжнай скарбніцы.

Па крупіцах сабіралася універсітэцкая бібліятэка. Вялікіх намаганняў каштавала папаўненне яе фондаў перш за ўсё самай неабходнай вучэбнай літаратурай.

Цяпер бібліятэцы ужо цесна ў яе памяшканнях. Кніжны фонд дасягнуў амаль мільёна тамоў, расшырылася кола задач і вырас калектыў. Але ветэраны, як і раней, у страі. Яны як бы і не змяніліся за гэтыя гады. Многа цікавых планаў, энергіі і настойлівасці ў Разаліі Герасімаўны. У гэтым годзе яна адзначае яшчэ адзін юбілей — яна камуніст з 25-гадовым стажам.

— Вельмі люблю сваю работу, — гаворыць Разалія Герасімаўна Любіна. — Зрабіць хочацца яшчэ многа, працую з задавальненнем.

Усё гэтак жа поўная добразычлівасці і клопатаў аб сваіх чытачах Анна Аронаўна Эвенчык, старшы бібліятэкар навуковай чытальнай залы. Яна ведае цану патрэбнай кнігі і зробіць усё, каб вы яе атрымалі!

Калі Анна Аронаўна кожны дзень з людзьмі, то Мар'яна Іванаўна Падскрабаева, загадчыца аддзела апрацоўкі літаратуры, больш часу праводзіць з кнігамі. Ад яе і супрацоўнікаў яе аддзела залежыць хуткасць з'яўлення новай літаратуры ў руках чытача, своечасовая інфармацыя аб навінках. Іх заслуга — штотыднёвая выстаўка паступіўшых у бібліятэку кніг, якая прыцягвае увагу соцень чытачоў розных рангаў.

А да Вольгі Леанідаўны ідуць за дапамогай, парадай, рэкамендацыямі кожны раз, калі даводзіцца мець справу з замежнай літаратурай. Эрудзіраваны спецыяліст, Вольга Леанідаўна паклала многа працы ў арганізацыю замежнага фонду літаратуры. Многія гады яна забяспечвала студэнтаў літаратурай для вывучэння замежных моў. Сёння яе галіна — замежная навуковая літаратура.

Цяпер універсітэцкая бібліятэка, дзякуючы паспяховай разнастайнай рабоце яе калектыву, прызнана лепшай сярод бібліятэк вну. Сюды едуць набірацца вопыту калегі з Петразаводскага, Саратаўскага, Харкаўскага, Кішынёўскага і іншых універсітэтаў, з розных бібліятэк. І ў гэтым вялікая заслуга ветэранаў.

НА ЗДЫМКАХ: ветэраны бібліятэчнай работы (злева) Р. Г. Любіна, А. А. Эвенчык (справа) О. Л. Ніканава, К. М. Пятосіна.

Фота М. Нічыпарэнкі.





# ЖЫВЕ НА ЗЯМЛІ ДЗЯЎЧЫНА...

Студэнт закончыў вну. Дзесяцікласнік прыйшоў на завод. У чалавека пачалося новае, самастойнае жыццё.

Рана ці позна, усе мы праходзім гэтыя этапы. Іменна этапы: пасля дзесяці класаў—інстытут, аспірантура... Усе яны ў роўнай ступені розныя і аднолькавыя. Розныя таму, што кожны наступны больш складаны і цяжкі. Аднолькавыя таму, што на кожным з іх ідзе ўсё той жа працэс фарміравання асобы.

У Лілі Доўнар пасля заканчэння сярэдняй школы выбар быў адзін—універсітэт. Яшчэ ў школе яна вызначыла свой далейшы жыццёвы шлях. У слове «настаўнік» для яе спалучалася ўсё самае прыгожае ў свеце.

Пяць год вучобы ў БДУ на філалагічным факультэце праляцелі хутка. Можа нават да крыўднага хутка.

Перад размеркаваннем на касыя позіркі некаторых сакурсніц і крыўдныя словы—маўляў, ёй, актывісту, любімчыку выкладчыкаў, «сам бог брат»—яна коратка адказала:

— Памыляецеся, дзяўчаткі. Мне ўсё роўна, дзе працаваць. Галоўнае, з карысцю для справы.

А на пытанні старшыні камісіі выказала сваю думку больш акрэслена:

— У сельскую школу.

Сама выпускніца сельскай школы, яна добра ведала яе надзённыя праблемы і настойлівыя патрабаванні і даўно для сябе ўсё вырашыла.

У адным ёй пашанцавала—працаваць накіравалі на радзіму.

А пасля з'явілася жаданне расшырыць кола сваіх адносін з людзьмі, прынесці яшчэ больш карысці на ніве выхаваўчай працы. І Ліля перайшла на партыйную работу.

Лілія Анатольеўна Доўнар — лектар Пухавіцкага райкома партыі. Акрамя сваёй непасрэднай работы, яна вядзе атэістычную прапаганду, кіруе групай дакладчыкаў.

Пра сябе Ліля гаворыць сціпла:

— Працую, як усе камуністы.

А. ЯРОХІН.

НА ЗДЫМКУ: Л. А. Доўнар.

Фота М. Чыбісава.



# БЕРАЖЫ Ж ТЫ ЯЕ...

Вось і зноў зацвіла вясна,
Неба сінь у вачах іскрыцца.
Так прыходзіць яна адна,
Каб ніколі не паўтарыцца.

Урываецца ў жыццё
І чаканай і нечаканай,
Як нябачнае адкрыццё,
Што за пошукам
наканавана.

Вельмі цяжка яе зберагчы,
Як усё, што нам раз даецца,
І памылак не справіш
нічым,
Калі іх зрабіць давядзецца.

Беражы ж ты яе, адну,
Што ў вачах маіх сініх
іскрыцца,
Маладзенькую вясну,
Што ніколі не паўтарыцца.

* * *

У вясны— салаўі,
Звонкі спеў навальніцы,
А ў восені — вецер
І плач жураваў.
Я б хацела табе
Белай кветкай прысніцца,
Толькі ты да мяне
Не вясною прыйшоў.

Ты скажы мне,
Мая шэравокая восень:
Хто з нас больш
У жыцці нешчаслівы такі,
Апрані ўсім на злосць
Замест шэрані—просінь,
Прынясі ты мне шчасце,
Як вясну жаўрукі.

Лена РУЦКАЯ

## ЗОРНЫ КАМЕНЬ

*Даль блакітнымі вачамі*
*Паглядае з-за ракі.*
*Я шукаю зорны камень—*
*Адкажыце, ёсць такі?*
*Мо няма такога цуда,*

*А прыдумала сама,*
*Ды шукаць усё роўна буду,*
*Хай сабе яго й няма...*

Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ

## НАТХНЕННЕ

Час бегуном бяжыць, —
Без фінішу і без старту.
Іду адна па мяжы
Юнацтва свайго і сталасці.
Мне дорыць вясну жаўрук.
А клёны частуюць сокам.

Мінулае—быццам рукапіс.
Вылінялы пад сонцам.
Учора яшчэ сівыя
Снягі шалясцелі-падалі.
Учора вятрыскі вылі
І лезлі пагрэцца ў хату.—

Даволі!
Усыхне бэз,
Ружовы, як летуценні,
І зноў на мяне паэзія
Зірне вачыма Ясеніна.
Патонуць і час і свет
Між выплеснутых радкоў...
Даволі!
Хай будзе светла.
А марнае — пад'адхон.

# У ВЯСНЫ—САЛАЎІ

**Вядома, у сённяшні святочны сакавіцкі дзень мае самыя светлыя пажаданні перш за ўсё ўсім жанчынам — сяброўкам, калегам, добрым таварышам. Але некалькі слоў і спецыяльна вам, нашы маладыя салавейкі. Няхай мацнеюць вашы галасы, натхняючы на вялікія подзвігі вашых аднагодкаў, няхай усё званчэй гучаць, хвалюючы сваёй шчырасцю і нас, вашых старэйшых таварышаў, настаўнікаў.**

**А. ЛОЙКА,**
**кіраўнік літаб'яднання «Узлёт», дацэнт філфака.**

## А ЧАМУ І НЕ ТАК?



* * *

Б'ю чалом маім славянам.
Добрым ветрам занясло.
За дубовымі сталамі
Уся радня мая — сяло.
Вось і зноў я адчуваю
Буйнасць хмельную ў душы.
З рук у рукі адплываюць
Беравозчыкі — каўшы.
Светла гукі ўваскрэслі.
Не Бетховен і не Бах—
Зацвітаюць буйна песні
У сялянак на губах.
Знаю, мне ў дарозе з вамі
Раздзяляць і хлеб, і соль.
За дубовымі сталамі
Уся радня мая — сяло.

* * *

Пазаві мяне, пазаві.
Там заблудзімся
ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая з'ява.
І тады душой не крывіць
Да апошняй крывавай
кроплі.

Яўгенія ЯНІШЧЫЦ

Пачынаецца ўсё з любві—
Першы поспех і першыя
крокі.
Прыручаюцца салаўі
І змяняюцца краявіды.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават ненавісць і агіда.

Пазаві мяне, пазаві.
Сто дарог ляжыць
за плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві,
А інакш жыццё немагчыма.



* * *

Заснуць бы... Раніца,
кажуць, мудрэй.
Гасне святло ў хаціне.
Ноч зацвіла. Тысяча чорных
дрэў
Узыйшлі на гасцінец.

Я знаю, на твой запеў
Пабеглі б хуткія ногі.
Ноч расцвіла. Тысяча
чорных дрэў
Заслапілі дарогу.

Ала ПАНКРАТАВА

* * *

**Я акно фіранкай занавешу,**
**Сёння мне цябе не выглядаць.**
**Прасуную ціха ціхі вечар,**
**Каб мой боль ніхто не мог пазнаць.**
**Мо яна званчэй званка смяецца,**
**За мяне цудоўней... і няхай.**
**Мне дасюль яшчэ праз сэрца льецца**
**Голас твой, як сонечны ручай.**
**Адцвітуць маёвым ранкам слівы,**
**Вобраз твой растане праз гады.**
**Буду я і сумнай, і маўклівай,**
**Толькі будзь заўжды шчаслівым ты!**

* * *

Як добра на пабыўку дамоў прыехаць!..
Я голас сястрынін пазнаю па смеху,
Напáру з якім б'е званец у званочкі
Ад ранняга ранку да позняе ночкі.
Азёры і пушчы! Ну як вам жывецца?
«Жывецца!..»—як брат, рэха мне адзавецца.
Па вас сумавала ў расстанні, вядома,
А сёння я з вамі, а сёння я—дома.
І плёсаў ігранне, бароў маіх гоман
Ніколі ў жыцці не аддам я, нікому.



# МУЖЧЫНЫ КАЖУЦЬ, ШТО...

*БЫЦЦАМ ЖАНЧЫНЫ ГАВОРАЦЬ БОЛЬШ, ЧЫМ ЯНЫ. Аб балбатлівасці жанчын складзена нямала анекдотаў і прыказак. Нядаўна венгерскія спецыялісты палажылі гэтаму канец — яны ўстанавілі, што ўвогуле мужчыны і жанчыны за сваё жыццё вымаўляюць аднолькавую колькасць слоў. Пры гэтым падлічана, што кожны чалавек гаворыць у сярэднім адзін час у дзень, на працягу жыцця гэта складае два з палавінай года. Калі ўсё сказанае чалавекам на працягу яго жыцця перанесці на паперу, то атрымаецца тысяча тамоў па чатырыста старонак у кожным.*

*ЖАНЧЫНЕ НІЧОГА НЕ КАШТУЕ ХУТКА ПАДРЫХТАВАЦЬ ВЫСОКАКАЛАРЫЙНЫ І СМАЧНЫ АБЕД. Сацыёлагі думаюць інакш. Па іх падліках, жанчыны ў два разы больш заняты дамашнім клопатам, чым на працы.*

*КОЖНАЯ ДРУГАЯ ЖАНЧЫНА НА СВЕЦЕ—ТАЎСЦЕННАЯ. Урачы ж гавораць, што больш усяго да іх звяртаюцца па пытаннях атлусцення мужчыны.*

Валянціна КОЎТУН

* * *

Я вырасту ля ганку летнім
ранкам,
Рукамі-голлямі паціху
стукну ў дзверы.
Матуля, прачынайся
на спатканне,
Мяне пазнай між іншых
росных дрэў.

Мне досыць, што далоні
пахнуць стрэчай
І мёдам ягад, ўчасна
адбрадзіўшых...
Матуля, прынясі мне
толькі вечар,
Як жменю чорных
выспеленых вішань.

* * *

Сустракаюцца,
ад'язджаюць,
Сіні сум — у маіх вачах,
Толькі рукі — як месяцымаі
Цвітуць у мяне на плячах.
Ад'язджаюць, шукаюць
выйсця...
А дарогі у нас — свае...
Толькі вусны, як цёплае
лісце,
Ападаюць на плечы мае.

Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.

Зак. 370. АТ 04444.